Самапомач

Беларуская Коопэратыўна-Гаспадарчая Часопісь

Год III. | Вільня, Верасень 1934 г. | № 9.

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамачу.

Джордж РЭСС ЭЛЬ
(*Ірляндзец*).



ЗЬМЕСТ № 9 (26).

Ceny ŭ Vilni
7—10.IX.34 h.

Zbožža.

Ceny pry kupli-prodažy za 100 kilo:

Žyta I	16.15
Votruby pšaničnyja	15,00—15,25

Ceny orjentacyjnyja za 100 kilo:

Žyta II stand.	15,00—15,25
Pšanica	17,50—18,75
Jačmień na pansak, źbirany	15,25
Avios standartovy	14,80 - 15.00
Muka pšaničnaja	13.50—33 00
Muka, žytniaja 55%	24.00 - 24.50
Muka žytniaja 65%	21.00—21 75
Muka žytniaja sitkovaja	16 00 - 16.50
Muka žytniaja razovaja	17.00—17 50
Votruby žytnija	10 00 —10.50
Siena	4.50— 5.50
Saloma	3.50— 4.00

Małočnaje, 31.VIII.34.

Masła najlepšaje, za kilo ŭ hurcie	2.20
„ „ „ „ „ u detalu	2.40
Masła stałovaje za kilo ŭ hurcie	2 00
„ „ „ „ „ u detalu	2.20
Syr navahradzki, za kilo ŭ hurcie	2.20
„ „ „ „ „ u detalu	2.60
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie	1.70
„ „ „ „ „ u detalu	2 00
Jajki, kapa	3.00—4 20
„ štuka	ad 6 da 8 hrašoŭ.

Miasny rynak, 28.VIII.34. za 1 kilo bitaj vahi:

Valovina, całyja štuki,	0.65—0.85
„ zady	0.70—1.00
„ pierady (košer)	0.90—1.10
Cialacina, 1 hat.	1.00 - 1 20
Svinina	1.05—1.15
Skury bydlačyja, syryja, za kilo	0 95—1.00
Skury cialačyja, za štuku	3.70

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŬNA-HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod III.	Vilnia, Vierasień 1934 h.	Nr. 9 (26).

KOOPERATYŬNYJA NAVINY.

14-ty Mižnarodny Kooperatyŭny Kanhres, jak my ŭžo pisali ŭ №5 „Samapomačy“ sioleta, byŭ naznačany i adbyŭsia ŭ Londanie ŭ mižčasie ad 4 da 7 vieraśnia ŭklučna. Ładziŭ hety Kanhres Mižnarodny Kooperatyŭny Sajuz— centralnaja arhanizacyja suśvietnaj kooperacyi. Staršynioj hetaha Sajuzu, zasnavanaha jšče ŭ 1895 h., jość finlandziec Vajno Tannör, a sekretarom — anhličanin Henry May. Siabrami Mižn. Koop. Sajuzu ŭ 1933 h. było 141 krajovaje kooperatyŭnaje abjednańnie, jakija łučyli ŭ sabie 91.000 (biez Savietaŭ) kooperatyvaŭ usiakaha vidu. Apošni kanhres M. K. Sajuzu adbyvaŭsia ŭ Vienie (Aŭstryja) ŭ 1930 h. Ad henaha času z M. K. Sajuzu vystupiŭ Sajuz spažyvieckich kooperatyvaŭ u Niamieččynie i silnaja arhanizacyja kanadyjskich*) pšaničnych pool'aŭ**).

Kanhres razhladaŭ i radziŭsia miž inšym nad tym, ci treba i na dalej utrymlivać u sile praviły kooperacyi vypracavanyja ročdelskimi pijanerami.

Arhanizatary Kanhresu, karystajučy z prysutnaści ŭ Londanie vialikaha liku kooperatyŭnych pracaŭnikoŭ z usiaho śvietu, sarhanizavali dla ich het. zvanuju Mižnarodnuju Kooperatyŭnuju Škołu i šmat inšych kooperatyŭnych imprezaŭ.

Bolš ab kanhresie napišam u nastupnym numary „Samapomačy“.

40 hadovy jubilej serbskaj (u Juhasłavii) kooperacyi śviatkavali 27-29 žniŭnia sioleta ŭ Biełhradzie vielmi ŭračysta. Serbskaja kooperacyja pačałasia z małoha ziarniaci 40 hadoŭ tamu nazad i siahońnia liča sarhanizavanych bolš jak 200.000 siemjaŭ u 2.800 kooperatyvach roznaha vidu. Na asablivuju ŭvahu zasłuhoŭvajuć serbskija kooperatyvy zdaroŭja, ab katorych abšyrna pisała „Samapomač“ №№ 9-10 letaś (1933).

Zaznačyć pry hetym treba, što abšar Serbii zajmaje 95.000 kvadratnych kilometraŭ, a lik nasielnictva dasiahaje ličby 4.100.000 čał.

---

*) Kanada heta paŭnočnaja susiedka Złučanych Štataŭ Paŭnočnaj Ameryki.

**) Pool — vymaŭlajecca p u l — heta arhanizacyja dziela zbytu zbožža, pieravažna pšanicy.

Сьв. п.
Др. Мікалай Ільляшэвіч

б. рэдактар беларускай сель.-гаспадарчай часопісі „САХА“, настаўнік Беларускай Філіі Дзяржаўнай Гімназіі ў Вільні і Віленскай Прав. Дух. Сэмінарыі памёр дня 2.IX. сёлета, ад сухотаў, на 31 г. свайго жыцьця.

Пахаваны на могілках Афрасінеўскіх у Вільні дня 5 верасьня 1934 году.

ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ!

Jašče ab zakładańni novych kooperatyvaŭ. Uvachod u siłu novaha zakonu ab kooperatyvach, jak viedama, šmat u čym źmianiŭ farmalnaści pry zakładańni novych kooperatyvaŭ. Ab vymohach kładzienych novym kooperatyvam z boku Kooperatyŭnaj Rady my pisali ŭžo ŭ № 6 „Samapomačy“. Tut dadadziom jašče paru ličbaŭ, jakija karysna znać kožnamu pry zakładańni novaj kooperatyvy s p a ž y v i e c k a j.

Kooperatyva, asabliva siahońnia, musić być samavystarčalnaj. Tamu z pajoŭ pry zasnavańni kooperatyvy treba mieć sabranych hetulki hrošaŭ, kab z imi možna było prynamsia pačać rabotu. Znaŭcy kažuć, što hetkaj sumaj na pačatak pavinna być najmienš 1000 załatovak. — Dalej, vielmi važnym jość zabaviazańnie nie pradavać ničoha na pavier; chto adnak daŭšy hetkuju raśpisku ŭsio-ž na pavier pradaje, toj moža być karany štrafam da 3.000 zł., abo areštam da 3 miesiacaŭ.

Lekcyi Zavočnaha Kursu Kooperacyi, z pryčyny spoźnienaha pryjezdu ŭ Vilniu lektarskaha i techničnaha personalu, pačnucca vysyłacca tolki ŭ m-cy kastryčniku. Novyja ŭčaśniki Kursu dalej prymajucca.

Novy zakon na pošcie. Ad 1-ha vieraśnia siol. abaviazvaje novy zakon, pavodle jakoha pry vysyłcy hrošaŭ praz P.K.O. treba dapłačyvać 10 hrašoŭ za pierasyłku ad 1 da 50 zł. Dahetul košty pierasyłki apłačyvaŭ ułaśnik konta.

Što rabić?

(U paradku dyskusii).

Źmiaščajučy nižej staćciu na aktualnuju siańnia temu „Što rabić?" — prosim zacikaŭlenych zabrać u hetaj spravie hołas. — **Red.**

Dla nikoha nia było i nia jość sekretam, što adradžeńnie biełaruskaha narodu da taho času budzie kulhać, pakul jano nia budzie mieć svaich sobskich haspadarčych padstavaŭ. Razumiejuć heta biełarusy i tamu ad samaha zarańnia svaje adradženskaje raboty chapajucca ŭžo za arhanizavańnie svajho haspadarčaha žyćcia. Ale razumiejuć heta i tyja vonkavyja siły, jakim adradžeńnie biełaruskaha narodu nie na ruku i tamu nie prapuskajuć nivodnaje mahčymaści, kab haspadarčaje ŭniezaležnieńnie biełaruskaha narodu źviaści na ništo, kab miesca jahonaje zaniać samym. Hetak było, hetak jość i hetak budzie dalej, kali na hetu halinu žyćcia nie źviartać naležnaj uvahi. Los Vilenskaha Sajuzu Kooperatyvaŭ paćvierdžaje nam heta ŭ niadaŭnaj prošłaści, a sučasnaje pałažeńnie kooperacyi ŭ našym kraju naahuł, a asabliva tych jaje składovych častak, jakija „dla śviatoha supakoju" nie vyrakajucca jšče svaje biełaruskaści, pakazvaje, što chod vypadkaŭ kłonicca ŭ bok jašče silniejšaha vonkavaha pryzoru, jaki dla volna arhanizujučahasia haspadarčaha žyćcia jość škodnym tormazam.

Ab kirunku i mahčymaściach jakoj-niebudź kooperatyŭnaj pracy na biełaruskich abšarach naahuł davoli vyrazna śviedčyć uradavy dakumant, źmieščany ŭ № 5 „Samapomačy". Dakumant heny staniecca jšče vyraźniejšym, kali dadać, što ŭspomnieny ŭ im hram. Lecko ŭžo „aščaśliŭleny" grašovaj pracaj, jakaja chiba nie pazvole ŭžo jamu dalej zajmacca pracaj hramadzkaj u pačatym kirunku. — Tojsamy los, jaki spatkaŭ hram. Lecku, spatykaje i inšych biełaruskich intelihientaŭ na vioscy.

Nia lepš dziejecca i z samymi kooperatyvami na vioscy ŭžo zasnavanymi i pracujučymi. Nia budziem hałasłoŭnymi i paŭtorym (heta bieśpiačniej, choć taksama nie zaŭsiody) fakt u biełaruskaj presie ŭžo drukavany i cenzuravany: u Lušnievie, Baranavickaha pavietu, palicyja načami padchodzić pad vokny miascovych kooperatyŭnych dziejačoŭ i śviecić elektryčnymi lichtarniami ŭ chatu. — Pa što?

Druhi prykład: kooperatyva „Dabrabyt" u Vial.-Krakotcy, Słonimskaha pav., pracavała ŭžo doŭhi čas i pracavała vielmi dobra, ab čym śviedčyć choć-by toje, što sučasny kryzys jaje navat nia tolki nie asłabiŭ, ale jana ŭ čas hetaha kryzysu zmahła navat pabudavać svoj ułasny dom. I mima taho heta kooperatyva nia maje nijakich daŭhoŭ, ani jakich inšych haspadarčych pryčyn dziela ŭpadku. Mieła heta kooperatyva adnak svoj „hrech piervarodny": jana nia čurałasia biełaruščyny, choć i była ŭ polskim kooperatyŭnym sajuzie. Kałoła heta niekamu vočy. Pavietavy-ž starasta pastaviŭ u sud, u Horadni, damahańnie skasavać hetu kooperatyvu z handlovaha rejestru i sud heta chutka zrabiŭ, a samyja haspadary kooperatyvy daviedalisia ab hetym tolki pa prysudzie.

Spažyvieckaja kooperatyva ŭ Milevičach, taho-ž Słonimskaha pav., nia mohučy paśpieć absłužyć usich svaich siabroŭ adnej kramaj, pastanaviła załažyć filiju svaje kramy ŭ susiedniaj vioscy. I što stałasia? Kali dvuch siabroŭ Nahladnaj Rady i dvuch siabroŭ Upravy, vykupiŭšy patent, pajechali ŭ henu viosku, kab naniać chatu pad kramu, dyk uhledziła ich palicyja, daniasła pavietavamu staraście, katory ŭsich prybyŭšych u spravie kooperatyvy, da taho — dvuch miascovych haspadaroŭ i haspadara chaty (katory navat pad tuju paru byŭ u lesie), razam 7 (siem) čałaviek, ukaraŭ štrafam kožnaha pa 20 załatovak, na tej padstavie, što jany byccam adbyvali nielehalnaje zboryšča.

U Niasviskim pav., u v. Vial.-Lipa, isnuje ad 1929 h. prykładnaja na ŭsiu vakolicu kooperatyŭnaja małačarnia. Siabry jaje navočna pierakanalisia, jakuju karyść moža dać kooperatyŭnaje pačynańnie i tamu letaś zasnavali kooperatyvu spažyvieckuju, nazvaŭšy jaje „Samapomač". Heta kooperatyva pašła taksama vielmi dobra. Ale mieła taksama piervarodny hrech — nia vyrakłasia dziela niečyich charošych vačej svaje biełaruskaści. Daviedvajemsia, što ŭ hetaj voś kooperatyvie anahdaj taksama źjaviłasia palicyja i zabrała jejny statut, što jość jaŭnym narušeńniem kooperatyŭnaha zakonu, jaki nakazvaje, što dakumenty kooperatyvy možna zabrać z aficyjalnaha pamieškańnia kooperatyvy tolki na vyraznaje žadańnie sudu...

Dy chto ŭsio heta i jamu padobnaje pieralіča?

Jasna, što pry sučasnym ładzie i sučasnym kooperatyŭnym zakonie vonkavyja, niekooperatyŭnyja čyńniki buduć stała ŭmiešyvacca ŭ žyćcio kooperatyvy i ad hetaha samaha kooperatyva akančalna zahubić najistotniejšuju svaju aznaku — haspadarčuju samadziejnaść. A kali tak, dyk jakaja-ž karyść dalej zachovyvać kooperatyŭnuju formu našych haspadarčych pačynańniaŭ? Ci pa toje, kab uściaž čakać niejkaj čužoj, paministersku apłačyvanaj revizii? Abo moža pa toje, kab dabravolna źviazyvać siabie z čužoj nam kulturaj? Ci heta apłacicca na siahońnia, a jašče bolš— jak vytłumačycca prad historyjaj?

Usio bolš i bolš nabirajecca prykładaŭ, što dahetulašniaje naša adnošańnie da aficyjalnaj u nas siahońnia kooperacyi treba zrevidavać i skazać jasna, ci nam, jak biełarusam, siahońnia z joj pa darozie. Jak ni škoda było-b pakidać uciortaha šlachu, ale kali heta ha vymahała-b dabro našaha narodu, dyk pakinuć jaho treba i biezadkładna pačać šlach

novy. U historyi heta nie piaršynia. Palaki pad Prusijaj, kali bačyli, što aficyjalnaja pruskaja kooperacyja niemčyć palakoŭ, nie astanavilisia na poŭdarohi, ale pačali arhanizavać „Spółki zarobkowe“, jakija volnyja byli ad naporu niamieckaści, dobra vykonyvali zadańni haspadarčyja i macavali narod jak całaść. Hetym treba vytłumačyć, što ŭ Paznanščynie i da siahońnia jašče hetyja „Spółki“ zachavalisia, bo narod ich acaniŭ i da ich pryvyk. Z druhoha ŭznoŭ boku takija Kasy Raiffeisena ŭ tej-ža Paznanščynie da siahońnia nia majuć vialikaha pasłuchu, bo narod tamašni pryvyk ich bačyć jak sposab giermanizacyi.

A ci-ž sučasnaja ŭ nas kooperacyja nie polonizuje našy vioski i miastečki?

Niachaj na ŭsio heta dašć adkaz kožny, chto cikavicca pytańniem haspadarčaha adradžeńnia biełaruskaha narodu. Ja z svajho boku pazvoliŭ-by zadać tolki pytańnie, ci nie para była-b i biełarusam pad Polščaj zrevidavać svajo stanovišča da aficyjalnaj sučasnaj kooperacyi i paviarnuć front u kirunku zakładańnia haspadarčych supałak na padstavie zakonu ci to ab supałkach z ahraničanaj adkaznaściu, ci placovak pryvatnych, ci jakich inšych. Adna tolki zaściaroha, kab u hetkich supałkach kavałasia nia tolki dabro materyjalnaje, ale kab u ich vyrablaŭsia i masavy duch hramadzkaści, jak heta mieła miesca prad vajnoj u palakoŭ pad Prusijaj.

Koratka kažučy, prychodzić čas, kali treba stvaryć formu adpaviadajučuju siahońniašnim varunkam. Dahetulašnija formy, pry sučasnym pałažeńni, dla nas za ciažkija.

Apracavańnie naležnaj formy i nadańnia joj hramadzkaha źmiestu — heta zadańnie našych praŭnikaŭ i ekanamistaŭ.

X. Y.

Da dyskusii ab „panskim lohkim chlebie“.

Žyćcio kirujecca svaimi zakonami, z jakimi prymušany rachavacca ludzi, kali nia chočuć astacca za łahvom žyćciovaha toku. Kožnaja revalucyja, kožnaja reforma, kožnaja ahułam ideja na stolki moža być pryščeplena adzinkam, hramadam, narodam, na kolki jošć patrebnyja da taho ŭmovy ŭnutranyja, na kolki jošć naśpieŭšy hrunt. Hramadzki henij tady tolki paciahnie za saboju ludziej, kali ŭmiecimie zakranuć žyvyja struny śviadomyja ci nieśviadomyja, adnak-ža naciahnutyja ŭžo i hatovyja zajhrać, chaj tolki voźmiecca da ich umiełaja ruka.

Adnym z asnaŭnych zakonaŭ i adnačasna śviatoje prava čałavieka — heta jahonaje imknieńnie da ščaścia. Usie zachady našyja, turboty majuć na ŭviecie tolki i vyklučna ščaście.

Ab henych tezach, ci nat' lepš kazać — faktach, nia treba zabyvacca, kali chočam abjektyŭna padyjści da pytańnia, abhavorvanaha na bačynach «Samapomačy» (№ 6 i №7-8).

Nia tre' dzivicca, što sielanin biełaruski, cikujučy ab ščaści kali i nie svaim asabistym, dyk ab ščaści dziaciej, słaŭ ich u škołu, chacieŭ vyvieści ich «u ludzi» i realizavaŭ henaje imknieńnie ŭ formie najlepšaj, jakuju bačyŭ pierad saboju. Nia šmat uzoraŭ jon bačyŭ pry svaich latucieńniach ab lepšaj doli. Najčaściej heta byŭ ziemleŭłaśnik—„pan“ z dvara, byli pradstaŭniki duchavienstva i šmat paźniej pryvyk jon sustrakać i cikavać na ludziej h. zv. volnych prafesijaŭ — daktaroŭ, advakataŭ i h. d. Handal amal nia vyklučna byŭ i jošć u rukach žydoŭ. I da siańnia pajmo handlar — heta abo kramnik u miastečku, abo kupiec śviniej ci aviečak, što chodzić pa vioskach, dy ledź umieje abaranicca ad haspadarskich sabak. I ramiasło najčaściej było ŭ rukach žydoŭskich.

Dziakujučy hetkim voś umovam biełaruskaha žyćcia vyraśli na našaj vioscy takija a nia inšyja adnosiny da vybaru prafesii ŭ baćkoŭ dy jasna — i ŭ dziaciej. I najbolš niahodnym było tutaka toje, što amal nia kožnaja adzinka, jakaja vychodziła z vioski, zaŭsiody łučyła ŭ čužuju atmasferu, čužanieła, rvała łučnašć sa svaim asiarodziščam. Źjavišča henaje, da niadaŭnaje pary ahulnaje, u nas było nacyjanalnaju trahedyjaju.

Siańnia havaryć „ab lohkim panskim chlebie“ ŭ sensie dasłoŭnym ,u suviazi z vybaram prafesii, źjaŭlajecca krychu anachranizmam. Žyćcio apošnich niekalkinaccaci hadoŭ vyraŭniała nienaturalnuju propašć pamiž sielaninam i rabotnikam, a paasobnymi halinami pracy volnych prafesijaŭ. Adnosiny da pracy fašystaŭ, hitleraŭcaŭ i h. d. paćviardžajuć tolki kolišni pamyłkovy pahlad na toje, što prynaležnašć da adnaje prafesii zabirała ludziej da čužoje klasy. Siańnia prynaležnašć da hrupy intelihencyi nie aznačaje, što treba čuracca „prostaha“.

Dasiulešnija chvoryja adnosiny ŭ našym biełaruskim žyćci musiać pieramianicca. Biada była nia tolki ŭ „biełaručnaści“, jak piša aŭtor u šostym numary „Samapomačy“, a ŭ tym, što zdarovy instynkt, imknieńnie da lepšaje doli, byŭ skryŭleny. Vychodziła, što kab lepš žyć, treba było vyrakacca svaje movy, minuŭščyny, samoha siabie. I ludzi žyli pad takoju suhestyjaju! A heta jašče bolšaja mana, jak da niadaŭnich dzion raspaŭsiudžany pahlad na varožašć pracaŭnikoŭ z intelihencyi i fizyčnych!

Kali hlaniem na spravu z hetkaje starany, dyk jasna nam budzie, što nijakaha šablonu nia možna tarnavać da taho, jakuju prafesiju choča vybrać čałaviek. Nia tre' nam nikoli zabyvacca, što kali hrošy nadta važny mament pry ździejśnieńni imknieńniaŭ čałavieka, adnak jany jašče nia ŭsio.

Klič „svoj čałaviek na svaim mieścy“ poŭny źmiestu nia tolki ŭ adnosinach da hramadzkaha žyćcia, a adnačasna, dy nat pradusim, da kožnaje paasobnaje adzinki. Tolki na

svajom miescy, u svajoj formie moža čałaviek znajści svajo ščaście.

Postup techniki, nieabchodnaść vykarystańnia pryrodnych zdolnaściaŭ i svomaściaŭ čałavieka, znajšli svaju formu ŭ instytutach psychotechničnych i h. zv. navukovaj arhanizacyi pracy. Čałavieku dajuć takoje stanovišča, da jakoha jon maje najbolš zdolnaściaŭ i nachiłu. Kožny z nas maje ŭ sabie ŭnutrany hołas-instynkt, jaki nam budzie našym instytutam psychotechničnym, treba tolki jaho słuchać.

Dziela takich razvažańniaŭ možam zusim nie razdumvajučy doŭha padpisacca pad tezaju redakcyi, kali jana piša: **„kožny chaj prabivajecca tudy, kudy maje paciah, a hałoŭnaje — na što adčuvaje zdolnaść, siłu“.**

Kažuć, što moładź siańniašniaja horšaja za ŭčarašniuju ci za pazaŭčarašniuju, što jana mienš idejnaja, bolš oportunistyčnaja... Adkaz na heta nia łohki. Adno za toje peŭnaje, što moładź siańniašniaja duža ćviarozaja. Dziela hetaha treba spadziavacca, što čad, u jakom žyli pradstaŭniki biełaruskaje vioski, uciakajučy ad svajho nacyjanalnaha ŭłońnia, prapadzie. Tolki na svajoj nivie možna rašci bujna i radavacca žyćciom! Toj, chto nie zapluščyvaje vačej, bačyć i siańnia heta jasna. Patreby našyja dy adnačasna mahčymaść zdavolić svaje imknieńni, pahadziŭšy ich z nacyjanalnymi vymohami, vializarnyja. Tolki treba być viernym sabie, svajoj natury, nie pałochacca błahoje, na pahlad, końjunktury taje ci inšaje prafesii.

Dr. St. Hrynkievič.

AD REDAKCYI: Hetym zamykajem tymčasam vielmi cikavy abmien dumak ab vybary šlachoŭ, kudoju maje jści biełaruskaja moładź, asabliva taja, katoraja kančaje škoły siarednija i nakiroŭvajecca ŭ škoły vyšejvyja. Z taho, što drukavałasia i z tych piśmaŭ, jakija pryšli ŭ redakcyju i nia drukujucca dziela aščadnaści miesca, jasna pieravažaje dumka, kab pry vybary prafesii kandydaty kiravalisia pieradusim **svaimi zdolnaściami i achvotaj.** Mamenty końjunkturalnyja — što siahońnia apłačvajecca, a što nie — majuć vahu vielmi małuju, bo što siahońnia maje vielmi trudnyja varunki bytavańnia, toje zaŭtra moža mieć varunki vielmi dobryja, i naadvarot. Dy ŭreščie dla kulturalnaha pracaŭnika końjunktury być nia moža; naadvarot, **čym bolš niejkaja halina pracy zapuščanaja, tym bolš i tym lepšyja tudy treba nakiroŭvać siły!**

U dyskusii zusim nie zakranuty byŭ bok materyjalnaha zabieśpiačeńnia vučačajsia moładzi. Heta pytańnie pavinna vyjści z radoŭ samoj moładzi. Adnu tolki zaściarohu tut treba zrabić, majučy praktyku z hadoŭ prošłych. Studenstva na hetulki maje prava na ŭspamohu z hramadzkich srodkaŭ, na kolki jano samo ŭkładaje siły na pavialičańnie zapasaŭ hetaha hramadzkaha dabra. Koratka kažučy, hramadzianstva choča bačyć svajo studenstva nia tolki pry pryjmańni zapamohaŭ, ale i pry pracy, i to pry pracy **konstruktyŭnaj.** Heta varunak kaniešny.

Ci vytryvajem?

Paŭhodu tamu nazad pavialičyli my „Samapomač“ u paŭtara razu, z tym, što ad 1-ha kastryčnika sioleta pašyrymsia jašče bolš — u dva razy.

Nia budziem adnak chavać praŭdy i skažam prosta, što kali akuratnaść našych čytačoŭ u prysyłańni svajoj sobskaj padpiski i źbirańni novych padpiščykaŭ zaraz-ža nie pavialičycca, dyk nia tolki nie dačakajemsia pavialičeńnia „Samapomačy“, ale prydziecca badaj što viarnucca da raźmieraŭ papiarednich. Nia było-b heta pachvalnym dla vydaviectva, ale kiepska heta śviedčyła-b i ab samych čytačoch, jakija chacieli-b tolki mieć pravy — atrymoŭvać rehularna i čytać časopiś, ale ŭciakali-b ad abaviazkaŭ — akuratnaha prysyłańnia svaje padpiski i źbirańnia štoraz novych płatnych padpiščykaŭ. Tymbolš, što „Samapomač“ u „dziesiatkach“ — heta-ž najtaniejšaja biełaruskaja časopiś; ale darma jana pasyłacaa nia moža, bo i joj ničoha darma nie dajecca.

Razumiejem pažadańnie našych čytačoŭ, kab časopiś pavialičyłasia, ale zrabić heta možna tolki tady, kali ŭ hetym kirunku buduć supracoŭničać i čytačy sami, bo praŭdaj zaŭsiody astaniecca, što časopiś takaja, jakija jejnyja čytačy.

Dziela ŭsiaho hetaha źviartajemsia z zaklikam:

HRAMADZIANIE!

1. **Nieadkładna ŭrehulujcie ŭsie svaje rachunki za čas minuły,** bo pasyłańnie asobnych prypaminańniaŭ vystaŭlała-b nas na lišnija jšče vydatki.

2. **Pašyrcie ličbu padpiščykaŭ** siarod Vašych blizkich i dalšych znajomych.

Usiakuju karespandencyju pasyłajcie na adres: Vilnia (Wilno) Połackaja 4—10; hrošy ž pasyłajcie praz čekavaje konta P. K. O. № 180.485 (ułaśnik konta inž. Klimovič). Ab sposabie pierasyłańnia hrošaŭ praz čekavaje konto daviedacca možna na kožnaj poščie.

Redakcyja i Administracyja „SAMAPOMAČY“.

Сельская гаспадарка.

Гадуйма авечкі.

Хто быў на сёлетняй выстаўцы футраў у Вільні, той заўважыў хіба адну адзіную,*) закіненую ў цёмны куток авечку: мелася яна, відаць, прадстаўляць сілу і важнасьць авечага роду, а прадстаўляла — сапраўдную сваю долю ў гаспадарчым жыцьці, долю закіненага стварэньня, якое бачыць чалавек тады толькі, калі хоча яно „стрыгчы.“ А шкода, бо авечка варта большай увагі. І тыя нават народы, якія, гонячыся за упрамыслаўленьнем земляробства, пакасавалі ў сябе гадоўлю авечак, як неаплатную (Нямеччына), зразумелі з часам сваю абмылку і сяньня поўнай парай гоняць назад, заводзячы гадоўлю авечак нанова.

Ня што іншае бачым і ў сучаснай Польшчы: пакасаваная гадоўля авечак прывяла да таго, што сягоньня Польшч прывозіць з заграніцы розных тавараў авечай гадоўлі на суму больш 70 мільёнаў залатовак у год. Гэта мноства прывозных тавараў авечай гадоўлі выражаецца цыфрай 25.000 тонаў. Краёвая-ж прадукцыя пакрывае толькі 5 проц. усяго запатрэбаваньня. Урадавыя чыньнікі Польшчы стараюцца сяньня ўсімі сіламі ўспамагчы гадоўлю авечак у краю і вымагаюць ад падрадчыкаў, якія дастаўляюць для казны суконныя напр. матэрыялы, каб выказаліся, што ў сваіх прадпрыемствах дамешваюць да прывознай воўны пэўны працэнт воўны краёвай. Найбольшы працэнт гэткай дамешкі вымагае войска (25 проц.), іншыя ўстановы — менш, ад 5 да 15 проц. Характэрна пры гэтым, што 72 проц. краёвай воўны ў гандлю ў Польшчы паходзіць з двух толькі ваяводзтваў заходніх, а рэшта абшару сучаснай Польшчы дастаўляе на рынак толькі 28 проц. гандлёвай воўны. І гэта тады, калі лік авечак у гэных жа заходніх ваяводзтвах (284.522) меншы, чым у аднэй напр. толькі Навагрудчыне (303.188) і ў пяць разоў меншы ад ліку тых-жа авечак у Беласточчыне, Віленшчыне, Навагрудчыне і на Палесьсі разам (1.520.881). Увесь блізу націск урадавых кругоў у кірунку падняцьця гадоўлі авечак таксама мінае землі беларускія і сьціроўваецца на захад і на поўдзень.

Незалежна ад таго аднак, ці, калі і якая помач урадавая для гадоўлі авечак дасягне наш край, гэта гадоўля, у інтарэсах самыхжа нашых земляробаў і наагул цэлага Краю, мусіць значна больш нас цікавіць, чым дагэтуль. Чым у польнай гаспадарцы ёсьць для нашых земель лён, тым у жывёлагадоўлі павінна быць авечка, бо яна сапраўды чалавека і апранае (аўчынка, воўна) і корміць (мяса і малако).

*) Толькі ў апошнія дні выстаўкі было прывезена авечак больш.

Аб аўчынцы перад гарбаваньнем.

Адным з важнейшых даходаў пры гадоўлі авечак ёсьць авечая аўчынка. Патрэбная яна перад усім на кажух, без каторага цяжка пражыць нашу беларускую зіму. Акрамя таго тая-ж авечая аўчынка перарабляецца адпаведна ў спэцыяльных фабрыках на матэрыял, з каторага вырабляюцца рукавіцы і іншыя гэтак званыя беласкурніцкія вырабы. Пры гэткім шырокім застасаваньні авечых аўчынак, здавалася-б, цана на іх павінна была-б быць адпаведнай. Тымчасам так ня ёсьць, ці лепш сказаць —цана на аўчынкі то ёсьць, але не на нашыя, а на прывозныя; мясцовыя-ж тавар або ня мае сусім збыту, або йдзе за 20 проц. ягонай сапраўднай вартасьці. Больш за мясцовую аўчынку ня дасьць ніводзін перакупшчык, бо ён, звычайна, таксама ня ведае ў чым цана гэтай аўчынкі і ў чым ейныя недахопы. А калі-б гэту вартасьць перакупшчык і ведаў, дык ён яе будзе ведаць напэўна для сябе і ўжо напэўна не для таго, ад каго гэту аўчынку купляе. Вось-жа дзеля гэтага рынковую вартасьць аўчынкі павінен знаць сам гаспадар— уласьнік авец: дасьць гэта яму магчымасьць

Гадоўля авечак аплачваецца, ясна, толькі тады, калі яе фахова пакіраваць. Ня трэба на гэта нават вялікіх грошаў; трэба толькі зразуменьня, што тое толькі будзе ў нас разьвівацца, што з тутэйшай зямлі вырасла. Усё прывознае ня вытрымае і занікае, хоцьбы яго няведама як паліваць, лялеяць, даглядаць. Усьведамленьне гадаўцоў аб гэтай праўдзе ёсьць адным з варункаў удачы ўсяе працы над гадоўляй авечак. Прапаганда ў гэтым кірунку патрэбная, але ні ў якім выпадку ня можа яна кіравацца мамэнтамі карысьці даразнай (скорай) і самай толькі матэрыяльнай. Гэткімі спосабамі шумна вядзецца ў нас прапаганда лёну і рэзультат гэтай прапаганды такі, што льняныя вырабы спаткаць можна сягоньня ўсюды, але толькі ня ў тых, хто іх вырабляе — там усемагутна пануюць яшчэ паркалікі, ядвабы і іншая пошасьць тандэты. Ня верыце? — Прыгледзьцеся да доўгага раду ткачак лёну, што ціснуцца ў Вільні з сваімі вырабамі да коопэратыўнае крамы збыту гэтых-жа вырабаў, да гэтак званага „Базару Народнага Промыслу.“

Наша аўчарства трэба прапагаваць і вясьці дарогамі сваімі.

А. Б.

АД РЭДАКЦЫІ: Аб рацыянальнай гадоўлі авечак напішам у найбліжэйшым часе.

вырабляць такія якраз аўчынкі, якіх патрачуе рынак і ўсьцеражэ прад магчымым надужыцьцем, а то і проста ашуканствам розных перакупшчыкаў.

Дык у чым-жа вартасьць аўчынкі — сырца? — Адказаць на гэта можна трымя пунктамі. Вартасьць авечай аўчынкі як сырца залежная ад таго: 1. які дагляд мела авечка за жыва, 2. якім спосабам была здымана аўчынка з авечкі зарэзанай і 3. як перахоўвалася аўчынка зьнятая. Скажам аб кожным з гэтых пунктаў па пары словаў.

Сырая (нявырабляная) аўчынка мае высокую рыначную вартасьць тады, калі яна сплош роўная, гладкая, ня мае ніякіх згрубеньняў, рубцоў (шрамоў), ні тымбольш — дзіраў. Авечка, покуль жывая, знаходзіцца ўсьцяж пад небясьпекай, што ейная аўчынка можа быць з вонкавага боку пакалечана ці то падчас пераскаківаньня платоў з калючага дроту, ці пакусана сабакамі, ці паранена рагамі скаціны, ці ўрэшце пакалечана якім іншым спосабам. Усякі такі незгладзімы сьлед у форме рубцоў, ці нават дзірак, рэчясная, абніжае рыначную вартасьць аўчынкі.

Сусім тое самае пагражае аўчынцы з нутранага боку, ад цела; толькі небясьпека гэта сьцісла ўжо агранічана часам: падчас, калі цэласьці аўчынкі з вонкавага боку (з таго боку дзе воўна) пагражае небясьпека праз цэлае жыцьцё авечкі, дык гэта небясьпека з нутранага боку агранічана толькі на пару здыманьня самой аўчынкі („бяленьне") з зарэзанай авечкі. Непрактычнасьць работніка ці толькі адзін мамэнт ягонай няўвагі і аўчынка з нутранага боку можа пакрыцца рознымі рубцамі, якія ўжо аднак не зарастуць і пры першай лепшай магчымасьці пераменяцца ў дзіркі.

Урэшце, старанна дагляданая аўчынка за жыва авечкі і добра зьнятая, можа за тры-чатыры гадзіны сапсавацца да нічога, калі адразу пакінуць яе без належнага дагляду. Насамперш псуецца самая верхняя частка аўчынкі, пад самай воўнай. Пазнаецца гэта псаваньне па тым, што на другой старане (ліц) зьяўляюцца жоўтыя плямы, каторых ня можна ўжо вывесьці і пры гарбаваньні. Акрамя таго, з мясцоў гэтак пашкоджаных хутка і лёгка вылазіць воўна.

Гэта — у вялікім прыбліжэньні — тыя небясьпекі, якія пагражаюць добрай якасьці авечай аўчынкі прад тым яшчэ, пакуль яна дастанецца ў фаховыя рукі гарбара. Дзеля захаваньня добрай якасьці аўчынкі, як сырца, трэба:

1. а) з пасьбішчаў і выганаў, кудэю праходзяць авечкі, паздымаць калючы дрот і замяніць яго звычайным плотам;

б) на пасьбішчы найлепш трымаць асобна авечкі ад быдла — станоўча аднак ня можна ўганяць скаціну разам з авечкамі ў вузкія вуліцы і вулачкі, асабліва калі яны выгараджаны калючым дротам;

б) у хлявох у авечую загарадку ня сьмее даставацца рагатая жывёла;

г) усякае абходжаньне з жывой жывёлай павінна быць „людзкім."

2. Пры здыманьні аўчынкі („бяленьне") ня ўжывіць нажа, а толькі ягоных тронкаў ці звычайнага кулака рукі; заграніцай ўжываюць да гэтага або гэтак званага пнэуматычнага нажа (у Францыі), або паміж скурай і мясам напампоўваюць паветра (на Балканах), ад чаго аўчынка роўна і гладка адстае ад мяса па ўсім целе.

3. Зьнятую аўчынку, асабліва ў летнюю пару, ня можна пакідаць пакомканай, сфалдаванай, але адразу трэба яе расьпяць (нацягнуць), воўнай ў сярэдзіну, і памясьціць у сухое правеўнае месца; усякяе астаўшае на аўчынцы мяса трэба старанна ачысьціць, а тое, якога ўжо звычайным спосабам зьняць ня можна — пасаліць, каб не псавалася.

З гэтак прыгатаваным таварам на купца і то — купца добрага доўга чакаць ня прыдзецца. Напэўна! **Гарбар.**

Тры гадаўляныя цікавасьці.

У заграцічнай земляробскай прэсе зьявіліся апошнім часам весткі аб трох, сапраўды цікавых спасьцярогах, важных для кожнага гадаўца хатняй жывёлы, які ня хоча гаспадарыць на сьлепа. Разгледзім іх коратка і па парадку.

Асабліва для гадаўцоў расовай скаціны вельмі важна дапільнаваць час цяленьня кароў. Лягчэй гэта рабіць, калі карова целіцца ўдзень, і цяжэй, калі целіцца ўночы. Вось-жа заграцічныя земляробы-практыкі заўважылі, што пара дня цяленьня каровы залежыць ад таго, у якую пару дня целячаяся карова была апошні раз прад цяленьнем доена. І так, калі карова прад запушчэньнем апошні раз была доена ўвечары, дык яна ацеліцца ў н о ч ы. Калі-ж гэткая карова была апошні раз доена раніцай ці серад дня, дык і ацеліцца яна таксама д н ё м. Больш таго—карова доеная апошні раз прад засушэньнем днём, ацеліцца як раз у тую гадзіну, у якую яна была апошні раз доена. Вывад з гэтага такі, што калі хто хоча, каб ягоная карова цялілася ня ўночы а днём, той мусіць апошні раз даіць карову ня ўвечары, а раніцай або серад дня.

Другой важнай рэчай ёсьць ведаць наперад прынамся на дванаццаць гадзін, калі пайменна карова будзе цяліцца. Тут з помаччу земляробу прыходзіць тэрмомэтр, ці лепш кажучы, тая спасьцярога, што тэмпэратура цельнай каровы за чатыры гадзіны перад ацяленьнем ападае роўна на адзін градус. У апошнім месяцы перад ацяленьнем карова мае тэмпэратуру звычайна 39.5°Ц. Вось жа калі гэта тэмпэратура абніжыцца на 38.5°Ц, дык гэта нямінучы знак, што цераз чатыры гадзіны наступіць цяленьне.

Урэшце трэцяя справа, гэта спосаб адгаданьня роду будучага цяляці. Больш таго: у граніцах людзкой магчымасьці ляжыць: ці

будучае цялё будзе цялушачкай ці бычком. Калі карова была прыпушчана вечарам і з поўным нявыдаеным вымем, дык тады будзе цялушачка. Калі-ж карова была прыпушчана ў іншую пару дня і з парожным вымем, дык нічога пэўнага аб родзе будучага цяляці ня можна сказаць: можа быць і так, але можа быць і гэтак.

Усё гэта, пэўне-ж, рэчы, якія ня ў кожным месцы могуць апраўдацца. Але варта было-б, каб нехта і ў нас іх спробаваў і апісаў рэзультаты. С. Я.

Сап (Насацізна).

(*Malleus humidus*).

Істота і пашырэньне.

Сап гэта заразная хвароба, выкліканая асобным бацылам; цягнецца звычайна доўга (хронічны), радзей нападае раптоўна Ёсьць гэта спэцыяльная хвароба аднакапытнікаў; іншая жывёла уважалася для яе недаступнай. У 1923г. аднак было сьцьверджана, што сап пераносіцца і на козаў. У мэнажэрыях (перавозных малых зьвярынцах) узноў было сьцьверджана, што сап пераносіцца і на дросных зьвярат з сям'і катоў.

Бацыл сапа выклікае на тым месцы, дзе загнезьдзіцца, крупінкі і вузьлікі, з каторых паўстаюць пасьля верады (скулы). Пераносяцца бацылы з аднаго месца на другое разам з вытокамі гэтых верадаў (матэрыяй), або беспасярэдна з хворай жывёлы на здаровую, або пры пасярэдніцтве ўсякіх прадметаў заражаных гэтымі бацыламі (хляўныя прылады, кантары, сёдлы, усякія пакрывалы, судзіна да напайваньня, корм і г. д.).

Чалавек, які даглядае коняў хворых на сап і не захоўвае асьцярожнасьці, таксама можа заразіцца сам; гэткае перанясеньне сапа на чалавека, на шчасьце, даволі рэдка здараецца, але яно ня выключана.

Прыметы за жыва.

Прыметы хваробы бываюць розныя, залежна ад характару хваробы і ад таго, якія органы ёю захвачаны. Калі хвароба мае характар павольны, дык конь можа на яе цярпець тыдні, месяцы, нават гады, а асаблівых азнакаў хваробы самой аднак ня будзе.

Знаем два галоўныя віды гэтай хваробы: сап н а с а в ы, прычым могуць быць ахвачаны хваробай і іншыя дыхальныя органы (часамі хворыя бываюць толькі лёгкія) і сап н а с к у р н ы (у народнай гутарцы ведамы як рабак).

Да азнакаў насавога сапу належа вытак з носу, пэўныя зьмены на сьлізьніцы ў носе і зьмены (пухліна) лімфатычных гручолаў у глытніцы. Вытак з носу бывае аднастаронны або і двустаронны, спачатку сьлізісты, белы або шэры, пасьля больш гнойны, жоўты, зелянкавы або колеру нявыразнага; часам можа быць перамешаны крывёй. На сьлізьніцы ў носе патворацца малыя крупінкі, якія пасьля распадаюцца, ператвараюцца ў верады, спачатку плоскія; пасьля гэтыя верады расшыраюцца і правалiваюцца, ад чаго берагі іх выглядаюць быццам пакусаныя. Гэтыя верады часта сплываюцца ў адзін сплашны верад, падобны да мапы. Паадзіночныя верады могуць загаіцца і пасьля паўстаюць блізны на кшталт зорак і праменьняў. Гручолы пад ськівіцай напухаюць спачатку туга і пружна, пасьля становяцца цьвёрдымі, аднак не рапеюць, як гэта бывае пры золзах. Хворую жывёлу мучыць кашаль, дыханьне становіцца цяжкім (пры сапе гарлянкі і лёгкіх), а з носу часам ідзе кроў. Калі хвароба зацягваецца, дык жывёла худзее, морыцца хутка пры працы, а поўсьць становіцца дыбам.

Пры наскурным сапе творацца прышчы і верады на паверхні скуры, часьцей аднак пад скурай, быццам гарэхі, а часам і большыя валдыры (гузы), каторыя па кароткім часе зьмякчэюць, правальваюцца і твораць верады, з каторых выдзяляецца тугаватая хоць і рэдкая цеча, часта з крывёй. Берагі гэтых верадаў таксама набракшыя і выглядаюць як быццам былі-б некім пакусаныя. Гэтыя верады зусім ня хочаць гаіцца. Спатыкаюцца яны найчасьцей на нагах, на грудзёх і на брусе. Ад аднаго валдыра да другога праходзіць пад скурай ланцужкаватае спалучэньне—гэта ахвачаныя хваробай лімфатычныя жылы, прабягаючыя да найбліжэйшых лімфатычных гручолаў, таксама набракшых і пабольшаных. Пры хронічным сапе часта здараецца роўнамернае, сплашное, бязбольнае і вельмі тугое набракненьне скуры і падскурнай ткані, асабліва на задніх нагах, звычайна на аднэй; можа аднак быць захвачана некалькі ног адначасна і тады называецца гэта элефантіазіс. Гэта набракненьне можа так-жа быць на плоцявых ворганах і на галаве. У набракшай скуры могуць быць валдыры, верады і ў форме ланцугоў набракшыя лімфатычныя жылы; адпаведныя гручолы таксама збольшаныя і цьвёрдыя. Хронічны сап можа трываць цэлыя гады.

Востры (раптоўны) сап мае выгляд агульнай цяжкой гарачкавай хваробы. Пачынаецца востры сап трасцай, наперамену з высокай гарачкай, пасьля пакажыцца сьлізіста гнойны вытак з носу, на сьлізьніцы паявяцца прышчы і верады, дыханьне становіцца цяжкім і голасным, зьявяцца то ж валдыры і верады ў скуры, з адначасным набракненьнем лімфатычных жылаў і гручолаў. Сьмерць наступае боль-менш цераз 5—14 дзён.

Пасьмертныя прыметы.

Акрамя прышчаў, верадаў і г. д., каторыя можна было пазнаць ужо за жыва, па сьмерці знаходзяцца падобныя зьмены у вышэйшых часьцях насной шчалугі (поласьці), у шчалугах лобных і ськівічных, у гарлянцы

і ў дыхальным горле. У лёгкіх бываюць крупінкі вялічынёй просавага зярняці, кругом счырванеўшыя; большыя крупіны (вузельчыкі) бываюць акружаныя шэрай павалокай. Далей, спатыкаем тут размякшыя логвы з грубымі, быццам мазолістымі сьценамі (г. зв. кавэрны сапу) і тугія, мазолістыя, вялічынёй з гарэх, а нават і з дзіцячую галаву наросты (шышакі). Калі сап абхапіў лёгкія, тады ручолы ґарляныя і лёгачныя заўсяды бываюць набракшымі. Логвы сапу могуць таксама быць у селязёнцы, у печані, у нырках, у сэрцы, у плоцявых органах і ў касьцях. Пры вострым сапе, акрамя шматлікіх вузьлікаў і верадаў, бываюць таксама зачырванелыя мясцы ў лёгкіх, пры чым шчалугі выпаўнены адмёршай тканьню і загноіўшайся матэрыяй; калі-ж логвы сапу сягаюць аж на паверх лёгкіх, дык захопленай бывае так-жа лёгачная павалока і пакрыта адлучальнымі (аддзіраючыміся) кускамі павалокі і адкрытымі ранамі.

Што рабіць калі акажыцца хвароба.

Калі хто заўважыць самую хваробу сапу або ейныя адзнакі ў коняў жывых або ў паўшых, павінен аб гэтым зараз-жа паведаміць вэтэрынарную паліцыю. Гаспадар захварэўшай жывёлы мусіць сам аддзяліць хворую жывёлу ад здаровай, старанна закопываць падлу і прыбіраць усё, чым можа быць перанесена зараза. Зьдзіраць скуру з падлы забаронена; ня можна таксама хворых, ані нават падазроных у хваробе зьвярат забіваць (рэзаць). Асоба, якая даглядае хворую жывёлу, ня сьмее даглядаць іншую жывёлу, здаровую і ня сьмее спаць у стайні разам з хворай жывёлай. Да дагляду хворых ці толькі падозраных жывёлаў ня сьмее быць ужытай асоба, якая мае параненыя рукі ці іншыя непакрытыя часьці цела.

Сап у людзей.

Калі выдзяліны хворай жывёлы праз няўвагу ці праз нядбальства дастануцца чалавеку на нейкую рану, на сьлізьніцу наса, роту або ў вока, дык ад гэтага чалавек можа заразіцца на сап. Хвароба праяўляецца ўжо на 3-ці ці на 5-ты дзень і пазнаецца па тым, што кругом заражанага месца і найбліжэйшых жылаў і гручолаў лімфатычных зьяўляецца пухліна. Дзеля гэтага пры даглядзе жывёлы хворай на сап і падозранай трэба быць вельмі асьцярожным. Калі-б міма ўсяго аднак чалавек заразіўся сапам, дык як толькі можна скарэй трэба шукаць помачы лекарскай. Нажаль, аднак навука дагэтуль ня знае пэўнага леку ад сапу і гэткае заражэньне найчасьцей кончыцца ўжо сьмерцю. Дык тым уважней трэба абхадзіцца з хворай жывёлай і нічога не памінаць, што толькі можа ўсьцерагчы чалавека ад заразы.

Др. Ю. З.

Як скармліваць бульбу.

Бульбу можна скармліваць сырую, вараную, параную або сушаную. У захадніх краёх Эўропы ёсьць нават вялікія фабрычныя сушарні на бульбу і бульбяная мука даволі добра плаціцца. Калі хочам мець добрыя вынікі з кармленьня бульбаю, дык мусім уважаць, каб дзенная порцыя ня была за вялікая, бо яна для кожнага роду жывёлы іншая.

Асабліва пры кармленьні кароваў сырою бульбаю трэба ўважаць на порцыі. Сырая бульба мае ў сабе вострыя складнікі (аміды і амідовыя кіслоты), якія ў меншых порцыях карысна ўплываюць на трыбух і ўвесь кармовы апарат, але затое ў большай дзеннай порцыі ўплываюць шкадліва. Таксама прарасшая бульба мае шкадлівыя сучасткі, якія пры большых порцыях бульбы шкодзяць асабліва цельным коровам. Дзеля таго прарасшыя бульбіны трэба адбіраць. Сырой бульбы можна даваць дойным каровам 10–15 кілё ў дзень; большыя порцыі псуюць якасьць малака і масла. Каровы найлепш травяць бульбу абмытую і дробна пакроеную; каб з сечанай бульбы не марнаваўся сок, трэба яе мяшаць з сечкаю. Смачней ядуць каровы бульбу цэлую, а каб пры гэтым не давіліся, трэба ўважаць, каб суседнія каровы не дасягалі да іх і не дражнілі, бо тады такая карова сьпяшаецца і можа ўдавіцца. Варанай бульбы можна даваць карове 20—30 кілё ў дзень; аднак што да страўнага бялка, дык вараная бульба менш вартасная, бо пры варэньні бялок зварваецца і становіцца менш страўным.

Сьвіні лепш травяць бульбу вараную, або параную чым сырую і варанай бульбы можна даваць ім да насычэньня. — Коням ня вольна даваць бульбы больш як 4—6 кілё ў дзень, і то — варанай; пры большай порцыі коні скора мучацца, пацеюць, трацяць вытрываласьць і сілу. Часам радзяць даваць коням і сырую бульбу, 1—2 кілё ў дзень, як сродак на прачышчэньне.

Пры гадаваньні хатняй жывёлы на жыр, прыгодная найлепш бульба вараная, бо такая найлепш выкарыстоўваецца.

Інж. О. Я.

Аб зімовым гнязьдзе для пчолаў.

Улетку пчолы займаюць цэлы вулей. На зімку аднак, прачуваючы зімно, яны зьбіраюцца бліжэй сябе, сядаючы ў форме аднаго суцэльнага, рухомага клубка. Месца, дзе гэтак пчолы зьбіраюцца на зіму, называем гняздом, якое закладаецца больш-менш пасярэдзіне вульля, насупроць лёткі, каб быў лягчэйшы доступ вольнага, чыстага паветра. Зьбіраючыся зімаваць, пчолы аднак памятаюць ня толькі аб забесьпячэньні сябе ад сьцюжы, — яны памятаюць і аб забясьпечаньні сябе ад голаду. Інакш кажучы, пчалінае гняздо на зіму гэта ня толькі больш ці менш выгодная адпачывальня, але і добра абдуманая кладоўка (сьпіжарня); гэта апошняе вельмі важнае, бо пчолы маюць асаблівую натуру і — як гэта пабачым далей — могуць згінуць ад голаду ня толькі тады, калі ў вульлі няма запасаў мёду, але нават тады, калі гэтага мёду поўны вулей, ды ён толькі неадпаведна ўложаны.

Вось што пішыцца аб гэтым у „Ziemlarobskaj čytancy:"

„Прынята рахаваць, што ў плястры з рамкі Дадан'а ёсьць у сярэднім 2 кл. (5 фунтаў) мёду. Знача, цэлая зімовая порцыя мёду мусіць мясьціцца ў 7-ох плястрох і з гэтулькіх, найменш, плястроў трэба будаваць г. зв. з і м о в а е г н я з д о для пчолаў. Пчолы з наступленьнем халадоў не сядзяць паразьлязаўшыся па ўсіх плястрох, але зьбіраюцца ўдоле плястроў, творачы гэтак званы зімавальны к л у б о к.

Гэты пачаткавы клубок не завязваецца на залітых мёдам і зашытых маяйсцох плястра, але толькі на сушы. Шукаючы корм пчаліны клубок ступянёва пасуваецца толькі ўверх і низдольны пасувацца ўніз. І калі-б так нават здарылася, што плястровая суш была ня ўнізе плястра, а ўсярэдзіне, ці нават зьверху, дык пчолы, асеўшы клубком на гэтай сушы, усяроўна пасуваліся-б толькі ўверх; а не знашоўшы там мёду,—адміралі-б з голаду нават тады,калі-б удол ад сушы плястры былі поўныя найлепшага мёду. Згэтуль навука, што на закладаньне зімовага пчалінага гнязда трэба выбіраць плястры з зашытым мёдам уверсе і з сушай — унізе. Дольныя краі плястроў мусяць быць усе на аднэй вышыні бо ў праціўным разе зімавальны клубок завязываўся-б на вышыні найвышэйшага плястру, а рэшта марнавалася б.

Важным ёсьць таксама і разьмер зімовага гнязда. бо ў малым гнязьдзе пчолы маглі-б задушыцца. Але да гэтага трэба ўжо здольнасьці вычуваньня, якая здабываецца практыкай і якой ані словам, ані пісьмом здабыць нельга."

Хто больш цікаеіцца гэтай справай, знойдзе адказ у названай ужо „Ziemlarobskaj Čytancy" č. I.

А. К.

Кармленьне пчолаў.

Месяц жнівень гэта — з малымі выняткамі (верас) — канец пчалінай пашы; пчаляр мусіць прагледзіць паадзіночныя пні і запасы дапоўніць. Хоць цэлая справа здаецца надта-ж ужо простай і зразумелай, патрабуе шмат увагі. Блізу ўсе неарганізаваныя пчаляры проста спадзяюцца на тое, што запасаў мёду па лазьбінах (адбіраньні мёду) на зіму хопіць. Трэба аднак рахавацца з тым, што належна зазімаваная пчаліная сям'я мусіць мець найменш 12, лепш 14—15 кілё мёду ў запасе. Павінна быць правілам, што надвыжка мёду ніколі з вульля ня згубіцца — выкарыстаецца ў годзе наступным. На жаль аднак і ў пчаляроў арганізаваных, мoгучых праз свае арганізацыі даставаць неападаткаваны цукар, спатыкаюцца часта грубыя абмылкі... Трэба перадусім ведаць, што расьцеча цукру (сыроп), або разьведзены мёд мусіць выпарыцца або дасьпець да таго часу, пакуль пчолы саб'юцца ў клубок, каб маглі гэты корм яшчэ зашыць (засклясіць). Бо калі корм падаецца за позна і пчолы не пасьпяваюць яго зашыць, тады цукар хутка кісьне, а гэта і бывае аднэй з прычын благога перазімаваньня. Падкормліваньнем пчол увосені апрача таго павялічваецца йшчэ лік тых маладых пчолак, каторыя могуць перазімаваць, г. знача такіх, якія йшчэ выклюнуцца ў пару, калі можна йшчэ будзе вылецець на аблёт. Гэтым самым запэўніваецца сіла вульля на вясну. Пачынаць падкармліваць трэба ўжо ў другой палове м-ца жніўня. Часам гэткае падкармліваньне пачынаецца ўжо ў першым тыдні м-ца жніўня: даецца што тыдзень па $^{1}/_{8}$ літра разьведзенага мёду і гэтым прымушаецца матка да складаньня яечак, з каторых і выйдуць тыя маладыя пчолкі, што будуць зімаваць.

Перш чым падкармліваць пчолы, трэба прагледзіць паадзіночныя пні, колькі ў кожным з іх ёсьць мёду ў запасе. Запасы ў гнязьдзе пакідаюцца, выбіраюцца толькі задні рамкі, каб на іх месца пасьля залажыць падушкі на зімаваньне. Пчаляра цікавіць таксама пытаньне, як перазімуюць пчолы на самым толькі мёдзе або на самым толькі цукры. Мёд канешна патрэбны для пчол пачынаючы ад месяца лютага, калі матка пачынае класьці яечкі, бо ў мёдзе, таксама як і ў пылку, знаходзяцца спажывы і наагул матэрыялы канешныя для пчалінага арганізму. З другога ўзноў боку цукар ёсьць вельмі добрым сродкам дзеля самага перазімаваньня. Дзеля гэтага найлепш даваць на зіму пчолам запасы на палову з мёду і на палову з цукру. Пры благой пагодзе, калі збор мёду ня хопіць і на гэтулькі, ягонае мноства бяз шкоды можна абніжыць да 3—4 кілё. Пры пераглядзе пчол практычны пчаляр лёгка пазнае, паводле лічбы і вагі рамак, колькі трэба дадаць цукру, каб дачакаць паловы

м-ца траўня (мая). Яшчэ раз трэба прыпомніць, што ашчаднасьць у гэту пару звычайна вельмі дорага абходзіцца... Лепш заўсёды пэўнасьць як дагадка, што можа вясна прыйдзе ў нармальны час і пчолы назьбіраюць сабе ў пару мёду сьвежага.

Дальшым канешным варункам ёсьць, каб кармленьне абавязкава пачыналася ўвечары, бо калі наліваць і падаваць корм днём, дык пры гэтым звычайна заманіваюцца ў вулей пчолы чужыя і прызвычайваюцца да зладзейства. Гэта тымбольш, што ў гэту пару няма ўжо звычайнай натуральнай пашы для пчол і яны бяруць што толькі дзе знайдуць. Каб да гэткай крадзяжы пчол ня прывучаць, трэба падаваць ім корм ужо за шэра і ў такім мностве, каб да раніцы, калі лётная пчала вылятае ў поле, уся порцыя была ўжо выссана. Лішне было-б высьцерагаць, каб падаючы корм ані поўкаплі яго не разьліць каля вулля, бо гэта таксама прывучае пчол да крадзежы.

У практыцы вельмі добрымі аказаліся порцыі па 3 – 4 літры для слабейшых семяў, або калі зімныя ночы, па два літры, такшто пры выстарчальным падаваньні падкармліваньне можна кончыць за тыдзень. Канешным ёсьць так жа, каб у судзіну падаваную з разьведзеным цукрам, замест практыкаваных у нас саломінак, укладаліся дзераўляныя дзюркаваныя кладачкі, пры каторых няма небясьпекі, што пчала ўтопіцца: а пры саламяных кладках гэта бывае на парадку дзенным.

Уважна таксама трэба прыгатаўляць і сам сыроп цукру. Ня можна рабіць гэткага сыропу за густым, бо ён хутка крысталізуецца і на вясну, калі пчолы ня могуць хутка вылецець па ваду, можа такі корм вельмі зашкодзіць. Ня менш шкодным можа аказацца і сыроп за рэдкі, асабліва тады, калі кормім за позна, бо хутка кісьне. Найлепш зробім, калі дадзём на 1 літр вады 1 кілё цукру, лёгка заварым зьбіраючы, пры гэтым з верху пену, а пасьля, прад тым як завараны сыроп зусім астыне, дададзём на 1 літр па каплі соку з цытрыны або сярэдняга раствору цытрынавай кіслаты. Дадатак цытрынавай кіслаты патрэбны на тое, каб аблегчыць перамену знаходзячайся ў звычайным цукры сахарозы, у даступныя для пчол цукры простыя: глюкозу і фруктозу.

Пасьля накармленьня за 2—3 тыдні праглядзём пчолы ўзноў, каб праканацца, ці добра запасы разложаныя. Бывае ня раз, што рой хоць меў вялікі запас мёду, адмёр з голаду. Чаму? — бо рамка запоўненая мёдам не пазваляла пчолам перайсьці на другую рамку. Гэткую небясьпеку лёгка цяпер можна абмінуць, калі пераложыць запоўненую рамку.

Ш—к.

Заквашываньне агуркоў.

(*Спосаб украінскі*).

Агародніна і садовіна проста неабходныя для людзкога здароўя. Дык як найбольш павінны мы іх ужываць.

Тут хачу падаць спосаб заквашываньня агуркоў пад Львовам.

Уступныя працы: Важнай справай ёсьць выбар бочкі на агуркі. Найлепшыя для гэтай мэты гэта бочкі ад віна, агуркоў або ад селядцоў (гэтыя маюць быць найлепшыя). Перад усім трэба бочку абгледзіць, ці не працякае; калі так, дык яе трэба выцэмэнтаваць. Пасьля такая бочка вымываецца спачатку летняй вадой, а пасьля гарачай, ставіцца на сонечным правеўным мейсцы, каб высахла (але каб не рассохлася).

Квасіць агуркі можна толькі сьвежыя, незавялыя, таму выбіраць іх трэба ў дзень заквашываньня. Калі-б з нейкіх прычын ня можна было іх таго самага дня заквасіць, тады трэба іх заліць зімнаю вадою і паставіць у сьцюдзёным месцы. Да квашэньня бяром агуркі сярэдняй вялікасьці, зялёныя і зусім здаровыя, непашкоджаныя. Найлепш надаюцца да квашэньня тыя сарты агуркоў, якія маюць шмат цукру, а гэта дзеля таго, што цукар зьяўляецца галоўным складнікам, які зьмяняецца пры фэрмэнтацыі (квашэньню). Дробнатворы замяняюць пры гэтым цукар на малочны квас.

Квашэньне. Дно бочкі пакрываецца лісьцём хрэну, некалькімі калівамі кропу. Акрамя таго абчышчаюцца некалькі кускоў хрэну, вымываюцца, разразаюцца і кідаюцца на спод бочкі, на тое, каб расол быў чысты. Пасьля ўкладаюцца радамі чыста вымытыя агуркі. Што колькі радоў — даецца часнок. Расьціраць яго ня трэба, толькі галоўка двойчы перарэзываецца ўпоперак і так даецца ў бочку. Нічога больш, ні лісьця дубовага, ні вішнёвага не дадаецца.

Налажыўшы гэтак агуркоў блізу пад верх бочкі, заліваем іх чыстай, сьвежай і зімнай (агуркі будуць цьвёрдыя) соленай вадой. Соль распускаецца ў другім начыньні (у вядры). Агуркі найлепш квасяцца тады, калі раствор солі бывае 4 5 проц., г. зн. на 100 літраў вады трэба даць 4—5 кілё солі Распусьціўшы соль —уліваюць яе ў бочку так, каб увесь раствор пакрыў зусім агуркі. Залітыя гэтак агуркі накрываюцца чыстым кружком і прыціскаюцца ня надта цяжкім каменем. Робіцца гэта на тое, каб раствор лягчэй ўпіваўся ў агуркі і каб утрудніць доступ паветра.

Ужо праз адзін дзень пачынаецца фэрмэнтацыя і салёны расол мутнее. На паверхні творыцца сіваватая павалока, а сам раствор квасьнее. Каб агуркі ня плесьнелі, кладзецца ў бочку крыха (10 грамаў) белай гарчыцы, завязанай ў чысты шматок.

Што рабіць з памідораў.

З розных бакоў пішуць да нас, што сёлета быў даволі добры год на памідоры. Добрыя гэта вестка сама па сабе, а яшчэ лепшая дзеля таго, што наша вёска ўжо разумее вартасьць гародніны для людзкога здароўя, што раз больш яе садзіць. У тых-жа пісьмах у рэдакцыю чытачы нашы просяць падаць спосабы выкарыстаньня гэтых памідораў. Ахвотна выконываем гэту просьбу і падаём ніжэй некалькі радаў, прыдатных для нашых вясковых варункаў. Падробныя апісаньні прыгатаваньня памідораў як стравы пададзём нашым чытачом у найбліжэйшым часе. Рэд.

Карысьць з гадаваньня і спажываньня памідораў будзе тады толькі поўнай, калі гэтыя памідоры можна будзе ўжываць як страву праз цэлы год. На вялікі жаль дасьпяваньне памідораў наградах, а нават і ў інспэктах агранічана кароткім часам. Дзеля таго трэба старацца раз у год дасьпеўшыя і сабраныя памідоры так захаваць, каб іх можна было ўжываць праз цэлы год. Робіцца гэта пры помачы гэтак званага консэрваваньня памідораў, або і звычайным сушэньнем.

I. Консэрваваньнем можна захаваць лепшы тавар, але і рабіць гэта крыху цяжэй. Да таго-ж пры консэрваваньні патрэбны звычайна дадаткі, на каторыя сягоньня ня кожны можа сабе пазволіць. Таму затрымаемся тут толькі на консэрваваньні ў соленай вадзе. Ужываюцца да гэтага памідоры сусім сьпелыя, але йшчэ цьвёрдыя, драбнейшыя, рэгулярнай формы. Гэтак выбраныя памідоры абмываюцца, абрываюцца ім шпянькі і ўкладаюцца роўнымі пластамі ў шкляныя слоікі, або ў звычайныя добра паліваныя гліняныя збаны, заліваюцца соленай вадой ($^1/_2$ кілё солі на 10 літраў мяккай пераваранай вады), шчыльна абвязваюцца пэргамінавай паперай, або чыста прыгатаваным пузыром і стэрылізуюцца. Справа стэрылізацыі ў гаспадарскіх варунках гэта „вялікі хлопат." Збанкі, у каторых панакладана да консэрваваньня па 1 кілё памідораў, устаўляюцца аж па роўна абвязкі ў кіпячую ваду і варацца 20 мінут. А пасьля такія перастэрылізаваныя слоікі састаўляюцца ў сухі, сьцюдзёны, але не марозьлівы склеп і перахоўваецца. Паміж абвязкай і заліўным сосам не павінна быць больш вольнага прастору, як 1 сантымэтр. Усе памідоры павінны быць у сосе, а каб яны ня выплывалі, іх трэба папрыціскаць чыстай талеркай, ако дубовым дэнкам.

Прыгатаўляючы лепшыя памідоравыя консэрвы трэба з памідораў зьняць скурку. Дзеля гэтага чыстыя памідоры кладуцца на рэшата і затопліваюцца на поўмінуты або і на адну мінуту ў кіпячай вадзе і пасьля зараз-жа ў вадзе сьцюдзёнай. Ад гэтага скурка на памідорах лопаецца і яе можна лёгка злупіць.

II. Іншы спосаб захаваньня памідораў гэта сушэньне, якое ўзноў перарабляе плады расьціраныя або разразаныя. Да сушэньня расьціраных пладоў прыгодны кожны памідор, сьпелы, перасьпелы, нават надапсуты, натуральна выбраўшы гэтыя сапсутыя часткі. Усё гэта прадусім ачышчаецца, абмываецца, расьціраецца, выбіраюцца шпянькі і разварываюцца ў мядзяных пабеляных катлох ці рондлях, без дадаваньня вады, да тае пары, пакуль скурка не адлупіцца ад мякіша. Атрыманую масу працэджваюць праз кухоннае сіта і ўзноў вараць да гушчыні сьмятаны. Атрыманае пюрэ накладаюць як бліны роўным пластом на сіты, пакрытыя пэргамінавай паперай, якую прад тым лёгка змачываюць вогкай губкай. Гэтак разложаныя пласты сушацца ў тэмпэратуры 50—60°Ц. Сушэньне кончана, калі ўся маса ссохлася ў роўную плітку, якая ня мае ўжо ў сабе вогкасьці. Пліткі гэтыя рэжацца на чатырохкутныя скрыначкі і гэтак ідуць на продаж. З 100 кілё сырых памідораў атрымоўваецца 5—6 кілё сушанага тавару. Перасушаны тавар крышыцца і цямнее; добры тавар мае колер цёмна-чырвоны.

III. Да сушэньня памідораў разрэзаных прыгодны толькі штукі добра высьпеленыя, або крыху недасьпеўшыя. Гэткія памідоры старанна ачышчаюцца, або нават здымаецца з іх скурка, як вышэй; буйнейшыя — разразаюцца 4—8 частак, меншыя — на палову, гарбатняй люжачкай выбіраюцца зярняты, раскладаюцца на сітах пакрытых лазовай ці якой іншай пляцёнкай і сушацца спачатку пры 60° пасьля 70°Ц., а пры канцы ўзноў ніжэйшай, каб не пачарнелі. Добры тавар трэба пры сушэньні некалькі разоў перакладаць.

З 100 кілёграмаў сырых памідораў атрымоўваюць 6—8 кілё памідораў сушаных.

Ц.

Да часу поўнага заквашаньня трымаюцца агуркі ў тэмпэратуры 15—18°С, дзеля таго, што ў гэтай тэмпэратуры добра разьвіваюцца карысныя дробнатворы (бактэрыі), пасьля пераносяцца ў зімное месца, найлепш у лядоўню. Агуркі добра перахоўваюцца пры недаступнасьці паветра. Калі-ж да іх дастанецца паветра, тады колькасьць квасоў зьменшываецца і расол можа стацца звычайным лугам, а тады наступае хуткае гніцьцё (квас бароніць прад гніцьцём). Дзеля таго пры выбіраньні агуркоў ня трэба трымаць бочкі доўга адчыненай і трэба захоўваць якнайбольшую чыстату. Фаховыя квашэльнікі трымаюць квашаныя агуркі ў адумысловых сажалках або студнях, бо тут яны найлепш перахоўваюцца.

Інж. П. З.

ГАСПАДАРЧАЯ ХРОНІКА.

Паводка на Палесьсі. З Палесься надходзяць чуткі аб катастрафальных насьледках сёлетняй вясьнянай сушы і летніх дажджоў. З вясны ўсё засушыла, а пасьля ўлетку праз 4 тыдні запарам пашлі дажджы, ад каторых пагніла ўся бульба; не ўцалела і іншая ярына. А што ўдалося неяк звязьці ў гумны, тое пазалівалі воды выступіўшых з бератоў рэк, так што прышлося ўсё перасушываць. Насельніцтву з абшараў занятых паводкай пагражае голад. Тымбольш што аб арганізаваньні нейкай помачы для пацярпеўшых дагэтуль нічагуткі ня чуваць, а ўся ўвага цэнтральных і мясцовых упадаў зьвернена на насьледкі паводкі ў Польшчы. Аб Палесьсі забыліся.

У справе зачыненьня агранамічнага Аддзелу пры Віленскім унівэрсытэце паднялася цэлая бура пратэстаў. Ці яны што памогуць — іншая рэч. Важна тут зазначыць толькі, што дагэтуль гэта справа нявыяшана, а сама забарона прыйманьня запісаў на першы курс абаснавана толькі на тэлефонічным загадзе з Варшавы.—З галасоў, забіраных у справе дальшага існаваньня гэтага Аддзелу пры Віленскім унівэрсытэце, выявілася не адна цікавасьць аб тым, хто і якія надзеі пакладае на гэту культуральную пляцоўку на нашых землях. Вось-жа мала, надта мала ўдалося пачуць у гэтай справе галасоў, якія ўважаюць загрожаную пляцоўку землярабскай навукі іменна як месца н а в у к і. Затое ўсюды амаль спатыкаць можна пагляд, што гэта „placówka kultury“ (каб-жаж толькі культуры) polskiej» і таму яе „трэба“ ратаваць, „трэба“ утрымаць. Адзін толькі голас адазваўся, што зачыненьне агранамічнага аддзелу, пасьля леташняга скасаваньня аддзелу фармацэўтыкі і цэлага раду катэдраў, гэта ня звычайнае і нявіннае „ашчаднасьцёвае“ стараньне, але гэта дальшае зьвяно ў кірунку павольнага, але сыстэматычнага скасаваньня ўсяго Унівэрсытэту ў Вільні. А ўсё гэта па тое, каб устрымаць прадукцыю мясцовых інтэлігенскіх сіл і каб на краёвым рынку працы даць месца сілам прывозным з Польшчы, а не мясцовым. — Ці так ёсьць у сапраўднасьці, мы беларусы сяньня ня ведаем, — ведаюць аб гэтым людзі, якія сядзяць „бліжэй аўтара.“ Мы сваё становішча да гэтай справы ўжо выказалі анагдай („Самапомач“ № 7—8) і да сказанага дададзём цяпер, што калі плацоўка празначаная для пашырэньня веды і навукі на нашых землях мае яшчэ іншыя, вышэй названыя мэты, ненавуковыя, дык сьлёзаў па гэткай „сьвятыні навукі“ мы праліваць ня будзем. Школу патрабуем, але гэта павінна быць сапраўды школа, а не экспозытура... палітычная. На заканчэньне зазначым яшчэ, што хочам школы, якая гадавала-б працаўнікоў для нашай вёскі, а ня чыноўнікаў для абшарніцкіх двароў.

Рэформа ці абціраньне сьлёзаў? Дня 1 жніўня міністр-прэм'ер Казлоўскі сказаў у клюбе ББ прамову ў справе палепшаньня быту землярабскага сялянства. Паводле паведамленьня польскай прэсы, Міністр зазначыў, што будуць зьменшаны даўгі малазямельным землярабам, незалежна ад таго, хто і колькі вінаваты. З гэтай акцыі ўраду мелі б скарыстаць тыя з сялян, хто прад 1 ліпнем 1932 г. задоўжыўся ў казённых банках, бяручы там пазычкі на мэліорацыю, на запамогу ў выпадках пошасьці, або на справы спэцыяльныя (цэлёвэ), а таксама на куплю зямлі ці на сплаты пры парцэляцыі. Таксама маюць быць перагледжаны даўгі малазямельных, што задоўжыліся купляючы зямлю з прыватнай парцэляцыі. Агульная рэформа, паводле тае-ж самае заявы, мела-б ісьці ў тым кірунку, каб памагчы задоўжанаму малазямельнаму сялянству; задоўжаныя-ж двары, як „гаспадарчыя трупы“, маюцца быць распарцэляваны паміж сялянамі...

На словах то ўсё гэта выглядае і не найгорш. Толькі бяда ў тым, што ад словаў да чыну яшчэ надта далёка, тымбольш, што гэткіх і ім падобных песьняў ад польскіх адказных палітыкаў сялянства чула ўжо шмат і шмат, а палажэньне ад гэтага ня толькі не папраўляецца, але наадварот, пагаршаецца. Дык ці і гэта прамова, замест стацца прадвесьнікам сапраўднай рэформы, не абмежыцца толькі абціраньнем сьлёзаў? Асабліва для мужыка беларускага, для каторага дагэтуль стала знаходзіліся нейкія „выняткі“ і ўсякія палёгкі яго „неяк“ міналі. Тымбольш, што ў рэгуляміне новай акцыі ўжо сягоньня прадбачыцца падзел тэрыторыі на такія абшары, на якіх гэты закон мае дзеіць поўнасьцю, а ёсьць і такія абшары, на каторых прадбачацца пэўныя агранічэньні. Судзячы з дагэтуляшняй практыкі можна спадзявацца, што і гэтым разам „крэсовыя“ абшарнікі знойдуць сабе моцных патронаў. А калі-б дзе нейкі іхны двор і праваліўся, дык хіба-ж не пападзецца ў рукі сялян мясцовых, але напэўна дастанецца прывозным з Польшчы колёністам.

Нязвыклая ліцытацыя. У канцы м-ца ліпня с. г. у Акружным Судзе ў Лідзе былі прададзены з ліцытацыі за падаткі двары графа Тамаша Замойскага. Абшар зьліцытаваных двароў, паложаных у Лідзкім і Валожынскім паветах, выносіць 7.403 га; да гэта-

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

га 160 з лішнім памешкальных і гаспадарскіх будынкаў. І ўсё гэта пайшло „з малатка“ за 425.000 (чатырыста дваццаць пяць тысяч) зл. або па 56 зл. і 60 грашоў за гэктар. — Гэта ліцытацыя моцна ўскалыхнула грамадзкую думку; не таму, што гэтай зямельнай ўласнасьцяй перастаў уладаць вялікі магнат, а таму, што вялізарныя гэтыя абшары усёроўна мінулі сялян, каторыя на гэтай зямлі працавалі і працуюць і перайшлі толькі з рук магната польскага ў рукі магнатэрыі жыдоўскай: спадчыну графа Замойскага адкупіла з ліцытацыі фірма Горацы Гэллер, прамыслова-гандлёвае Т-ва ў Варшаве. І гэта тады, калі вёска наша проста задыхаецца ад зямельнага голаду. Нешта тут а не ў парадку.

Зьезд у справе лёну ў м. Глыбокім адбыўся дня 19 жніўня сёлета. Учасьнікі зьезду радзіліся аб тым, як падняць гадоўлю лёну і як сарганізаваць ягоны збыт. Між іншым было пастаноўлена зьвярнуцца ў Земляробскі Банк („Рольны“), каб той сфінансаваў збыт лёну з сёлетняга ўраджаю.

Цукар і соль танеюць. Ад 1 верасьня цана на цукар абніжана на 15 грашоў на кілё, такшто 1 кілё цукру мае каштаваць 1 зл. 30 гр. У найбліжэйшым часе таксама мае патанець і шэрая соль. Гэта абніжка прыходзіць здаецца ўжо аднак па пары, бо сяляне нашы ў большасьці сваёй забыліся ўжо які смак цукру, а соль? — з усіх бакоў нашага краю маем весткі, што сяляне, ня могучы дакупіцца солі чалавечай, навучыліся адчышчаць для людзкога спажыцьця соль быдлячую і ёй абхадзіцца. Ясна, што пры гэткіх умовах спажыцьцё цукру і солі мусіла абніжыцца, а тым самым мусілі абніжыцца і даходы казённага манаполю. Абніжэньнем цэнаў на цукар і соль манаполь спадзяецца цяпер, што прыцягне больш спажыўцоў, а тымсамым пабольшыць і свае даходы. Ня будзем выпярэджваць фактаў, але нам здаецца, што і гэтыя цэны для згалеўшай вёскі усё роўна не па сіле. Коштам ападаткаваньня прадуктаў першай патрэбы для вёскі сягоньня манаполь не збагацее, напэўна не.

Зьніжка цаны на карасіну. Газэты падаюць, што ад 1-га верасьня пастаноўлена абніжыць цану на карасіну ў гурце на 20—25 проц. На гэту абніжку злажыліся: згода казны зьменшыць скарбовы падатак і згода чыгункі абніжыць кошты перавозу. Наступным заданьнем ёсьць дапільнаваць, каб гэта абніжка не асталася ў кішэнях крамнікаў, але коб дайшла і да самых спажыўцоў, дл я каторых яна прызначана.

Будзем мець узноў магазыны? Справа магазынаў на збожжа, аб якіх мы пісалі ў № 5 „Самапомачы,“ штораз больш і часьцей цікавіць людзей з таго ці іншага боку. Апрача таго, што такі магазын мог-бы служыць як мейсца складу збожжа празначанага на продаж, паказваюць, што мог-бы ён служыць і як рэзэрва (запас) з гадоў ураджайных, на гады менш ураджайныя, а то і проста галодныя. Словам, усё больш праўдападобным здаецца, што магазына вернуцца.

117 Законаў і распараджэньняў было выдана за апошні час у Нямеччыне ў справе помачы земляробам у сучасным гаспадарчым крызысе. А направа усё роўна ня прыходзіць —Сьведчыць гэта з аднаго боку, што самымі толькі законамі ніякай помачы даць ня можна; з другога ўзноў боку паказвае гэта, з якой ўпартасьцяй ідуць Немцы да свае мэты: не ўдаецца адно — хапаюцца за другое, але рук не апускаюць, ідуць наперад усьцяж. Да гэткіх толькі людзей сягоньня можа сьвет належыць.

Грошы—нягрошы. Ад 30 верасьня сёлета трацяць платнічую моц у вольным абароце сярэбраныя польскія пяцізлоткі (вялікія), эмітаваныя на падставе прэзыдэнскага распараджэньня з дня 5.XI.1927 г. Ад 1-га кастрычніка сёлета і да 30 верасьня 1936 г. манэты гэтыя будзе прымаць яшчэ Польскі Банк, а па гэтым часе — ніхто больш.

Наша пошта.

К—ва „Поўня“ у Бр. — у Вашай справе пададзём рэкурс. Толькі ня думайце, што ў гэтым ёсьць якаясь наша карысьць матэрыяльная.

К. Сьв. у Тр. — адказ Вам паслалі пісьмом.

інж. В. Р—к у Пр.: Кнігі жаданыя Вам высланы. Таксама два пісьмы. Ці птрымалі?

інж. М. Гавр—ко у Л.: Пісьмо ад Вас атрымалі. Просьбы аднак выканаць ня можам, бо справа зёлак у нас сарганізавана на спосаб коопэратыўны.

С. Ш. у Р. і Ядв. К—ая ў К.: Аб тым што рабіць з памідорамі, даведаецеся з сяньняшняга нумару „Самапомачы“ на бач. 83. Аб кулінарным заставаньні памідораў — наступным разам.

Я. М—к у К. — у справе памідораў — як вышэй. З дрэўцамі паступайце так, было падана ў № 11 „Самапомачы“ летась. У справе забесьпячэньня ад мышэй будзем шукаць сродкаў і як знайдзем — паведамім. Гадаўляная вартасьць зярнят дзічак у тым, што яны маюць больш жыцьцёвай сілы, чымся сарты аслабленыя гадаваньнем у варунках штучных (шчапленьне).

Т. Б—к у К.: пісьмо атрымалі, дзякуем. Просьбы аднак споўніць ня можам, бо ня маем на гэта ніякіх фондаў.

В—к у Кр.: за апісаньне падзеяў Вашай коопэратывы дзякуем Захаваем гэта для гісторыі коопэрацыі ў нашым краю.

Усім зацікаўленым Завочным Курсам Коопэрацыі: Ад м-ца кастрычніка с.г. узнаўляецца высыланьне лекцыяў Курсу. Новыя ўчасьнікі Курсу прымаюцца.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ